НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ ЯКАСЦІ ЭКСКУРСІЙ 13





АНТЫЦЫКЛОН «ВЕРНЕР» ПРЫНЁС ЗАМАРАЗКІ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. ПЯТНІЦА № 204 (30338)

## КОРАТКА

- ВУП Беларусі ў студзені — верасні вырас на 4,5 працэнта.
- **Памятны аўтограф Прэзідэнта Беларусі ўручаны студэнту ўніверсітэта ў Шанхаі.**
- МУС прапанавала Турцыі актывізаваць заключэнне пагаднення аб узаемным прызнанні правоў кіроўцы.
- **Домікі для зімоўкі чырванакніжных грызуноў размясцілі ў заказніку «Налібоцкі».**
- У Вялікім тэатры стартаваў сямейны конкурс «Навагодняя тэатральная цацка».
- **На аэрадроме «Ліпкі» ў Мінску 19 кастрычніка адкрыюць музей авіяцыйнай тэхнікі.**
- Новую пагранзаставу «Грабені» адкрылі ў Лельчыцкім раёне.
- **У цэнтры Жодзіна пачалося ўзвядзенне новай аўтастанцыі.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай МЫСЛІВЕЦ, дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«У беларускім грамадстве дастаткова высокі працэнт людзей, задаволеных сістэмай адукацыі, — больш за 72 працэнты. Вельмі пазітыўную выснову можна зрабіць з таго, што тры чвэрці апытаных падкрэслілі: якасць адукацыі ў першую чаргу залежыць ад жадання дзіцяці атрымліваць веды, вучыцца. Беларусы, паводле вынікаў даследавання, падтрымліваюць увядзенне школьнай формы. Як мінімум дзве трэці рэспандэнтаў выступаюць за тое, што яна павінна быць».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «КАЛІСЬЦІ САМА ІДЭЯ НАШАЙ ПРЫСУТНАСЦІ Ў АНТАРКТЫЦЫ ЗДАВАЛАСЯ АБСАЛЮТНА ДЗЁРЗКАЙ. АЛЕ МЫ ГЭТЫЯ НАВУКОВЫЯ ВЯРШЫНІ ПАКАРЫЛІ»

## Галоўная мэта пакарэння такіх вяршынь — рэальная эфектыўнасць

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з вучонымі і ўдзельнікамі антарктычных экспедыцый. Нядаўна скончылася 16-я беларуская антарктычная экспедыцыя, хутка пачнецца 17-я. Сустрэча атрымалася не пратакольнай, а прынцыповай, на перспектыву і разам з тым па-беларуску цёплай. Настрой сустрэчы кіраўнік дзяржавы задаў з першых хвілін. Ён падкрэсліў, што ўсе навуковыя даследаванні ў Антарктыдзе павінны мець практычныя мэты, а іх вынікі — ісці на карысць краіны.**



Фота БелТА.

У Палац Незалежнасці палярнікі прыехалі не з пустымі рукамі, а з экспазіцыяй рэчаў, неабходных для іх працы. Сярод экспанатаў, напрыклад, айчынныя прыборы і абсталяванне, патрэбныя палярнікам. Аляксей Гайдашоў, намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў і кіраўнік усіх беларускіх антарктычных экспедыцый, далажыў, што ва ўнікальных умовах Антарктыды выпрабоўваюцца складаныя прыборы, многія з якіх лепшыя за замежныя аналагі, а некаторыя наогул не маюць аналагаў у свеце. Увазе кіраўніка дзяржавы таксама прадставілі мінералы і кампаненты прыроднага асяроддзя Антарктыкі, узоры флоры і фаўны. Паказаць сапраўды ёсць што.

Як сімвал беларускага пакарэння Антарктыды палярнікі падарылі Прэзідэнту мінерал эндэрбіт, якому прыкладна чатыры мільярды гадоў. Мінерал унікальны. Па-першае, таму што ўяўляе сабой аснову крышталічнага фундамента Зямлі. А па-другое, таму што выхад мінералу на зямную паверхню адзначаны толькі ў Антарктыдзе. Падораны кіраўніку дзяржавы экземпляр быў здабыты ў раёне беларускай антарктычнай станцыі «Гара Вячэрняя». Дарэчы, беларуская «Гара Вячэрняя» — адна з 70 станцый, размешчаных у Антарктыдзе. Усяго сваю нерухомасць у гэтым рэгіёне маюць 30 краін — Беларусь у іх ліку. У 2006 годзе па рашэнні Прэзідэнта Беларусь падпісала галоўны дакумент, якім кіруюцца краіны, зацікаўленыя ў вывучэнні гэтага загадкавага рэгіёна, — Дагавор аб Антарктыцы. З 2006 года праведзена 16 беларускіх антарктычных экспедыцый, у якіх прыняў удзел 51 айчынны вучоны і спецыяліст, у тым ліку 22 чалавекі — два і больш разоў.

### АНТАРКТЫКА — ІДЭАЛЬНЫ ПРЫКЛАД НЕПРАДУЗЯТЫХ АДНОСІН ПАМІЖ КРАІНАМІ

Як заўважыў Прэзідэнт, калісьці сама ідэя нашай прысутнасці ў Антарктыцы здавалася абсалютна дзёрзкай. Гэтак жа, як ідэя засваення космасу. Але мы гэтыя навуковыя вяршыні пакарылі. «У 2006 годзе мной было падтрымана далучэнне суверэннай Беларусі да Дагавора аб Антарктыцы. Мы павінны былі захаваць напрацаваны за савецкім часам навуковы патэнцыял і пераемнасць даследаванняў. І на існуючай базе сфарміраваць нацыянальную навуковую школу, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Сёння ў зале шмат маладых людзей. Значыць, мы ўсё зрабілі правільна. Моладзь ідзе ў навуку, расце новае пакаленне спецыялістаў, развіваецца айчынныя навуковыя школы».

Літаральна праз тыдзень адпраўляецца ўжо 17-я беларуская антарктычная экспедыцыя. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта сведчыць аб паспяховасці праекта, які стаў такім жа стратэгічна важным, як будаўніцтва Беларускай атамнай станцыі, запуск касмічных спадарожнікаў і палёт у космас. СТАР. 2

Спажывец

# ...І халва з пякучым перцам

## Якімі салодкімі навагоднімі падарункамі парадуюць нас кандытары?

**Прыказку «рыхтуй сані летам...» беларускія вытворцы кандытарскіх вырабаў успрымаюць як прамое кіраўніцтва да дзеяння. Ужо сёння кандытарскія прадпрыемствы «Белдзяржхарчпрама» выпускаюць салодкія навагоднія падарункі, якія неўзабаве паступяць у магазіны. А мы раскажам вам, чым усіх нас парадуюць «Камунарка», «Спартак» і «Чырвоны харчавік», калі наступяць пераднавагоднія дні.** СТАР. 4




Навуку – у жыццё

# Празрыстае золата

## Рэсурсы рэгіёнаў прывабныя для бізнесу

**Асваенне новага для Беларусі віду гідрамінералаў можа стаць перспектыўным кірункам прамысловасці Гомельшчыны і прыцягнуць у рэгіён інвестараў. Унікальныя па сваім складзе падземныя воды выяўлены ў Лельчыцкім раёне. Вытворчасць па распрацоўцы радовішча ўльтрапрэсных вод — перспектыўны кірунак з вялікім экспартным патэнцыялам, упэўнены беларускія вучоныя.**

Вывучэннем новага для нашай краіны віду гідрамінеральных рэсурсаў займаецца Інстытут прыродакарыстання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

— На тэрыторыі Беларускага Палесся выяўлены ўнікальныя па сваім складзе ўльтрапрэсныя падземныя воды з мінералізацыяй ад 10 да 80 мг/дм$^3$. Найбольш значныя плошчы распаўсюджвання ўльтрапрэсных грунтавых вод устаноўлены на тэрыторыі Палесся, дзе яны прымеркаваны да адносна ўзвышаных участкаў водналедавіковых раўнін і другіх надпойменных тэрас на міжрэччах Убарці і Сцвігі, Случы і Пцічы, Цны і Лані, а таксама некаторых іншых рэк. Ультрапрэсныя падземныя воды з такім узроўнем мінералізацыі не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце сустракаюцца вельмі рэдка, — адзначае **вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі Васіль ПАШКЕВІЧ.** — Ультрапрэсныя падземныя воды такога кшталту актыўна выкарыстоўваюцца для бутэлькавага разліву ў якасці пітных вод. Яны з'яўляюцца геахімічнымі аналагамі вядомых марак пітных бутыляваных вод «Spa» (Бельгія), «Voss» (Нарвегія), «Arctic pearl» (Фінляндыя) і іншых. СТАР. 3

# «...АЛЕ МЫ ГЭТЫЯ НАВУКОВЫЯ ВЯРШЫНІ ПАКАРЫЛІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Краіна па праву ўвайшла ў элітны пул дзяржаў, якія асвойваюць Антарктыку. Агульнапрызнаны высокі ўзровень развіцця навукі і нашых тэхналогій. Сёння на самым аддаленым ад нас ледзяным кантыненце лунае беларускі сцяг, — сказаў ён. — Больш за тое, мы маем уласную навукова-даследчую станцыю «Гара Вячэрняя» з паўнацэннай інфраструктурай і сучаснымі навуковымі лабараторыямі. Што важна, там рэалізаваны самыя перадавыя тэхнічныя рашэнні. І гэтыя рашэнні — нашы, беларускія». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што беларусы валодаюць сур'ёзным навуковым і вытворчым патэнцыялам, адзначыў, што абсталяванне, распрацаванае беларускімі спецыялістамі, прымяняецца ў экстрэмальных умовах. Асобныя ўстаноўкі з'яўляюцца ўнікальнымі і не маюць аналагаў у свеце. «Нам трэба навучыцца не толькі іх вырабляць, але і рэалізоўваць. Усё павінна прыносіць грошы. Жыццё такое, — канстатаваў беларускі лідар. — Мяркую, што апрабаваныя ў Антарктыцы тэхналагічныя і канструктарскія рашэнні і матэрыялы было б нядрэнна выкарыстоўваць у розных галінах у Беларусі. Трэба падумаць, як вашы даследаванні могуць быць ужо цяпер ужыты ў рэальным сектары. Гэта будзе садзейнічаць развіццю кампетэнцый і сумежных кірункаў, стымуляваць высокатэхналагічныя вытворчасці».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, вельмі важна, што мы працягваем актыўна ўзаемадзейнічаць з іншымі краінамі ў справе асваення Антарктыды. Асабліва ён вылучыў Расію, супрацоўніцтва з якой у гэтым кірунку неаднаразова абмяркоўвалася на самым высокім узроўні. «Падтрымка будзе аказваецца, ды яна і цяпер аказваецца, прэтэнзій да Расіі няма. Усялякая будзе падтрымка. Натуральна, трэба працаваць разам, трэба дзяліцца вынікамі даследаванняў і гэтак далей», — адзначыў Прэзідэнт. Асобна, паводле яго слоў, міжнароднае супрацоўніцтва ў Антарктыцы важна сёння, калі складаная геапалітычная абстаноўка патрабуе пошуку новых напрамкаў супрацоўніцтва, прыняцця эфектыўных рашэнняў для прасоўвання стваральных ініцыятыў.

«Антарктыка — проста ідэальны прыклад непрадузятых і канструктыўных адносін паміж краінамі (дзякуй богу, што кавалак зямлі на планеце яшчэ ёсць, дзе можа ўсталёўваць такія адносіны). Па вялікім рахунку, навуковыя дасягненні ў такіх глабальных кірунках, як заваяванне космасу, развіццё атамнай энергетыкі, супрацьдзеянне пандэміям, асваенне палярных рэгіёнаў, з'яўляюцца важным інструментам міжнароднай дыпламатыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт цікавіўся не толькі кліматычнымі і экалагічнымі прагнозамі, біяразнастайнасцю і асаблівасцямі выжывання арганізмаў у суровым клімаце, але і тым, як гэта ў будучыні можа будзе выкарыстоўваць у навуцы і ў жыцці. «Вашы асабістыя ўражанні і гісторыі мне таксама цікавыя. Край суровы, праца не з лёгкіх, ды яшчэ ўдалечыні ад дома працяглы час. Мяркую, вам ёсць што расказаць», — падкрэсліў ён. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што і сам з задавальненнем пабываў бы ў Антарктыдзе. «Можа, калі-небудзь мы там з вамі і сустрэнемся. І больш дэталёва не толькі абмяркуем, але, як у народзе кажуць, памацаем усё, што там ёсць і да чаго можа дабрацца, — адзначыў ён. — А ўвогуле дзякуй вам за тое, што вы, захопленыя людзі, разумныя людзі, сягнулі ў самыя тайны нашай планеты і спрабуеце гэта прыстасаваць, прыўнесці ў наша жыццё».

## БЕЛАРУСЬ УНОСІЦЬ ЗНАЧНЫ ЎКЛАД У ДАСЛЕДАВАННЕ «БЕЛАГА» КАНТЫНЕНТА

Аб арганізацыі экспедыцыйнай дзейнасці і рэалізацыі навуковых даследаванняў у Антарктыдзе расказаў старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гусакоў. Ён нагадаў, што ў 2007 годзе быў створаны Рэспубліканскі цэнтр палярных даследаванняў. Яго асноўныя задачы — правядзенне беларускіх антарктычных экспедыцый, у тым ліку падбор кандыдатаў, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, распрацоўка транспартна-лагістычных схем, стварэнне і забеспячэнне беларускай антарктычнай станцыі. Цэнтр займаецца таксама і навуковымі даследаваннямі. Што да міжнароднага супрацоўніцтва, то Беларусь з'яўляецца паўнапраўным членам міжнародных супольнасцяў па даследаванні і вывучэнні Антарктыды. Актыўна ўдзельнічае ў міжнародных праграмах. «Рэспубліка Беларусь і беларускія даследчыя арганізацыі маюць 14 дагавораў аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве ў Антарктыцы з урадамі і арганізацыямі з дзевяці краін-удзельніц Дагавора аб Антарктыцы. Гэта Расія, Балгарыя, Турцыя, Новая Зеландыя, Вялікабрытанія, Францыя, Германія, Украіна», — адзначыў Уладзімір Гусакоў. Асобна ён вылучыў супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй. Паводле яго слоў, паміж беларускімі і расійскімі палярнікамі наладжана цесная навукова-тэхнічная кааперацыя, узгоднена транспартна-лагістычнае забеспячэнне і ўзаемны абмен навуковым персаналам.

«Месца Рэспублікі Беларусь у міжнародных супольнасцях па даследаванні і вывучэнні Антарктыды, а таксама цеснае ўзаемадзеянне ўдзельнікаў антарктычных экспедыцый з замежнымі калегамі дае магчымасць выгадна пазіцыянаваць нашу краіну як паўнапраўнага партнёра, які ўносіць значны ўклад у даследаванне гэтага кантынента», — адзначыў Уладзімір Гусакоў.

Што да вынікаў навуковых даследаванняў, то, па словах кіраўніка НАН, навуковыя вынікі, атрыманыя ў Антарктыцы, з'яўляюцца ўнікальнымі і маюць фундаментальнае значэнне. Глабальныя працэсы, якія адбываюцца на гэтым кантыненце, шмат у чым адлюстроўваюць дынаміку змены клімату планеты і ўплываюць на захаванне біяразнастайнасці. «Даследаванне беларусаў у Антарктыцы — гэта даследаванне параметраў атмасферы, азонасферы, геалагічныя, геафізічныя, сейсмалагічныя, метэаралагічныя назіранні, комплексны аналіз біяразнастайнасці і маніторынг прыродных экасістэм. Хацеў бы вылучыць практычную накіраванасць нашых даследаванняў. Напрыклад, дзякуючы празрыстай атмасферы, гэты рэгіён падыходзіць для палётнай каліброўкі аптычнай апаратуры нашага касмічнага апарата», — удакладніў Уладзімір Гусакоў. Акрамя таго, нетры кантынента маюць сур'ёзны запас розных карысных выкапняў, у тым ліку і нафты. Але ў адпаведнасці з Дагаворам аб Антарктыцы на міжнародным узроўні дзейнічае забарона на распрацоўку і здабычу карысных выкапняў да 2049 года. Цяпер рэгіён выкарыстоўваецца толькі ў мірных і навуковых мэтах. «Характэрна, што антарктычныя жывыя сістэмы лепш генетычна прыстасаваны да экстрэмальных умоў, а таксама могуць выпрацоўваць і назапашваць біялагічныя злучэнні шырокага фармацэўтычнага прызначэння, уключаючы антыбіётыкі, супрацьвірусныя, супрацьпухлінныя, антыаксідантныя, супрацьзапаленчыя злучэнні. Таму многія краіны сталі актыўна праводзіць даследаванні патэнцыялу Антарктыды з пункту гледжання біялагічных і сыравінных рэсурсаў. І мы гэтым таксама актыўна займаемся. І ўжо выкарыстоўваем некаторыя выцяжкі ў нашых медпрэпаратах», — распавёў Уладзімір Гусакоў. Таксама ён адзначыў, што навуковыя даследаванні ў Антарктыдзе садзейнічаюць развіццю сумежных напрамкаў, у тым ліку распрацоўкі айчыннага абсталявання і прыборнай базы для функцыянавання ў экстрэмальных умовах.

## «ПАД БЕЛАРУСКІМ СЦЯГАМ МЫ СПАКОЙНЫЯ ЗА СЯБЕ І ЗА БЛІЗКІХ»

Аляксей Гайдашоў, намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў і начальнік усіх беларускіх антарктычных экспедыцый, расказаў, з чым насамрэч сутыкаюцца беларусы ў Антарктыдзе. Ён падкрэсліў, што асваенне Антарктыды раўназначна палёту ў космас і атамнай энергетыцы. Аляксей Гайдашоў расказаў, што з 2006 да 2014 года беларускія палярнікі туліліся ў былой палявой аэрадромнай базе каля гары Вячэрняя, дадзенай на першы час расійскім бокам. «Жорсткія ўмовы, дзіравыя будынкі, якія не абаграваюцца. Але задачы, пастаўленыя перад намі, энтузіязм людзей, прафесіяналаў, якія там працавалі, гэта пераламалі. І мы адчувалі дзяржаўную падтрымку», — успомніў ён.

У 2015 годзе быў створаны першы аб'ект беларускай станцыі. З 2015 года да цяперашняга часу станцыя з аднаго аб'екта перарасла ў 19, якія ўключаюць у сябе медыцынскі стацыянар, лабараторыі, навуковыя лабараторыі, тэхналагічныя і бытавыя памяшканні, памяшканні для тэхнікі. «Зразумела, у такіх умовах мы павінны эфектыўна працаваць, тут няма іншых варыянтаў. І тыя, хто туды адпраўляецца ў гэтыя жорсткія ўмовы, цудоўна разумеюць, для чаго і навошта яны туды едуць», — зрабіў акцэнт Аляксей Гайдашоў. Сучасную станцыю ён назваў пунктам апоры для выканання ключавых задач беларускіх палярнікаў. «Вынікі нашых намаганняў атрымліваюць высокую ацэнку міжнароднай навуковай супольнасці. У 2020 годзе станцыю інспектавала інспекцыя ўрада Аўстраліі. У заключным акце было ўказана: станцыя прызнана высокатэхналагічнай, сучаснай, экалагічна бяспечнай, прыхільнай да навуковых даследаванняў. І прызнана адной з найлепшых станцый, пабудаванай у Антарктыдзе за апошняе дзесяцігоддзе», — расказаў начальнік антарктычных экспедыцый.

Аляксей Гайдашоў зрабіў акцэнт на тым, што пры правядзенні навуковых даследаванняў беларусы не залежаць ад імпарту. Тэхналагічныя распрацоўкі станцыі, прыборы, харчаванне, адзенне — усё сваё. «Мы спакойныя цяпер з пункту гледжання жыццезабеспячэння, абслугоўвання станцыі і гэтак далей», — падкрэсліў ён.

Начальнік палярных экспедыцый распавёў, што калі ў першыя гады беларускія палярнікі працавалі ў радыусе найбліжэйшых кіламетраў ад свайго месцазнаходжання і ўся навука рабілася «на каленках», то з'яўленне станцыі і сучасныя тэхнічныя ўмовы дазволілі пашырыць геаграфію даследаванняў. Так, падчас 16-й экспедыцыі беларусы правялі далёкі шматдзённы навуковы паход у раён Антарктыды, які не быў даследаваны раней. Аляксей Гайдашоў расказаў, што яны выйшлі да горнага масіву агульнай плошчай 36 тысяч квадратных кіламетраў, што супастаўна з плошчай Мінскай вобласці. І беларусы даследавалі раён. «Гэта перспектыва з пункту гледжання навуковых даследаванняў і магчымых пошукаў будучых карысных выкапняў. І гэта работа, раўназначная выхаду ў адкрыты космас, будзе прадаўжацца», — лічыць кіраўнік экспедыцый. Працяглась маршруту, які беларусы пераадолелі ў гэтым паходзе, — 870 кіламетраў, плошча абследавання — 1050 кіламетраў. І хоць маршрут прапрацоўваўся паветранай разведкай, спадарожнікавай здымкай, рыхтавалася тэхніка, старанна планаваўся маршрут, беларусы ішлі ў невядомасць. «У канцавым пункце маршруту мы разгарнулі Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Кропкі ўсяго маршруту абазначалі спецыяльнымі прыладамі з дзяржаўнай сімволікай Рэспублікі Беларусь. Кропкі абследавання таксама абазначаліся рэперам з дзяржаўнай сімволікай. І на фінішы — разгорнуты сцяг. Там не было ні тэлебачання, ні гледачоў. Мы разгарнулі сцяг, таму што з 2006 года з гонарам працуем пад ім. З ім мы спакойныя за сябе і за сваіх блізкіх», — падзяліўся Аляксей Гайдашоў. Той самы сцяг з белага кантынента быў уручаны Прэзідэнту асабіста ад удзельнікаў гэтага гістарычнага паходу.

## ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫНІКІ. КАНКРЭТНЫЯ ВЫНІКІ ДЛЯ КРАІНЫ

Прэзідэнт спытаў, аб чым марыць дырэктар Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў Уладзімір Рыжыкаў. Той прызнаўся, што яго асабістая мара — пабываць на гэтым загадкавым кантыненце. Але Прэзідэнт заўважыў, што дырэктар цэнтра палярных даследаванняў там і так пабывае. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся «дзяржаўнай марай» дырэктара цэнтра. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на работу беларусаў у Антарктыдзе выдзяляюцца немалыя грошы. Таму дзяржава мае права спытаць за рэальны вынік. Пакуль жа размова ідзе толькі аб перспектывах на будучыню і ведах вучоных, якія яны атрымліваюць у рамках экспедыцый. Уладзімір Рыжыкаў таксама адзначыў, што дасягненні беларускіх палярнікаў прызнаюць на міжнародным узроўні, што немалаважна.

«Зразумела, пакуль практыкаарыентаванасць нуль, усё фундаменталізм. Фундаментальная гэтая навука. А ў будучыні мы можам разлічваць на значныя нейкія дывідэнды, якіх сёння пакуль няма?» — удакладніў Прэзідэнт. Як растлумачыў дырэктар цэнтра палярных даследаванняў, асаблівасць кантынента ў тым, што адразу атрымаць практычны выхад нельга. Для гэтага патрэбны час, і немалы. Тым больш некаторыя практыкаарыентаваныя напрацоўкі ўсё ж ёсць. Напрыклад, выкарыстанне біялагічна актыўных рэчываў, якія там атрыманы.

«Я задаю гэтыя пытанні, каб зразумець ролю Акадэміі навук, якая тут працуе, на зямлі. Ці дастаткова глыбока тое, што вы там накапалі, груба кажучы, выкарыстоўваецца тут. Там вы ўсе даследаванні не правядзяце. Вы на перадавой, нешта недзе дасталі, сфатаграфавалі, прамацалі... Акадэмія навук павінна працаваць тут. Можа быць, ваш цэнтр, яшчэ нейкія інстытуты. Вось гэта для мяне вельмі важна», — растлумачыў сваю пазіцыю Аляксандр Лукашэнка. І дадаў, што практыкаарыентаванай найперш павінна быць праца тут, у Беларусі, з матэрыяламі і інфармацыяй, атрыманымі ад палярнікаў.

Прэзідэнт адзначыў, што практычныя вынікі работы патрэбны і для таго, каб не згубіцца сярод уладных людзей. «Я не пакутую на нейкую гігантаманію, але, калі мы ўжо туды прыйшлі, значыць, павінна быць для краіны бачна, што мы там нешта атрымаем. І пажадана ў нашым жыцці. Так, трэба ў будучыню глядзець, я заўсёды пра гэта гавару. Але будучыня добрая, калі яна заземлена на сапраўдным жыцці. І на гэта я хачу вас арыентаваць, — падкрэсліў ён. — Павінны быць вынікі. Канкрэтныя вынікі». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што вельмі паважае вучоных. Але ў той жа час ён заклікаў іх устрымацца ад гучных заяў, нічым не матываваных. «Сёння патрэбен вынік. На гэта трацяцца вялізныя грошы. Мы адцягваем людскія рэсурсы. І, упэўнены, яны там калупаюцца пры тэмпературы мінус 40, умовы там не дай бог, нешта вам выдалі. А тут усё ў шафе. Гэтага не павінна быць. Павінна быць дынаміка. І ваш вынік мы павінны пакратаць рукамі», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы ў першую чаргу да прадстаўнікоў Акадэміі навук. Ён заявіў, што нельга дапусціць таго, каб людзі працавалі ў тых цяжкіх умовах, а выніку не было.

## ЧАГО НЕ ХАПАЕ ПАЛЯРНІКАМ?

Аляксандр Лукашэнка канкрэтна спытаў у палярнікаў, што менавіта ім трэба для таго, каб працаваць яшчэ больш эфектыўна. Аляксей Гайдашоў папрасіў на нарматыўным узроўні вызначыць статус палярніка. Цяпер яны па сутнасці з'яўляюцца сезоннымі работнікамі. Гэта ўплывае на захаванне стажу, бо на час экспедыцый палярнікі павінны звальняцца з асноўнага месцы работы. А пасля вяртання зноў шукаць сабе работу. «Па статусе трэба вызначыцца і ўнесці прапановы, — пагадзіўся Прэзідэнт і даў адпаведныя даручэнні. — Гэта адзінкавыя людзі. Таму паглядзіце. Медыцынскае абслугоўванне і гэтак далей». Яшчэ адна просьба начальніка палярных экспедыцый датычыцца некаторых карэкціровак заканадаўства аб закупках у тым, што датычыцца патрэб палярнікаў. Часам, калі трэба набыць нешта канкрэтнае і няма альтэрнатывы, гэта працэдура можа быць дастаткова складанай. «Наша галоўная задача — бяспека. Мы працуем доўгі тэрмін у аўтаномным рэжыме», — адзначыў ён. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў, каб такія рашэнні па закупках кропкава для антарктычных экспедыцый прымаў кіраўнік НАН Беларусі. «Думаю, для палярнікаў гэта будзе ідэальны варыянт», — пагадзіўся Аляксей Гайдашоў.

«Добра, што вы адчуваеце сябе і сваіх родных і блізкіх у бяспецы. Гэта мая праца і клопат, мой, урада, вертыкалі ўлады. Мы гэта будзем рабіць, каб вы там спакойна на навуковым мірным фронце ваявалі. Мы будзем гэта рабіць. Але я вас прашу, каб вы былі сапраўднымі вучонымі. Зрабіў крок, здабыў нешта — дзе вынік. Па-сапраўднаму, каб не адзін, два, тры чалавекі турбаваліся за гэта, а ўся краіна і кожны чалавек», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да палярнікаў. На заканчэнне сустрэчы Прэзідэнт падзякаваў палярнікам за іх работу. «Трэба, каб мы маглі народу хоць нешта паказаць. Так, мы ў космасе, ды атамная станцыя. Так, біятэхналагічная карпарацыя, чатыры ці пяць дзяржаў у свеце толькі маюць. Так, імідж вялікі, пакратаць можна. Вось і Антарктыда... Але трэба, каб было што пакратаць», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба працаваць так, каб кожны жыхар нашай краіны мог з гонарам сказаць, што беларусы прысутнічаюць у Антарктыдзе і ад гэтага ёсць вынік.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Празрыстае золата

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вучоныя Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі звяртаюць увагу, што выяўленыя ўльтрапрэсныя воды валодаюць вельмі добрымі смакавымі якасцямі. Важна, што такая вада рэкамендавана пры цукровым дыябеце і іншых парушэннях абмену рэчываў, пры атручваннях, выдатная для прыгатавання дыетычнага і дзіцячага харчавання.

— Ультрапрэсныя воды характарызуюцца шэрагам каштоўных бальнеалагічных уласцівасцяў, што дазваляе выкарыстоўваць іх у санаторна-курортнай практыцы, — дадае Васіль Пашкевіч.

Як звяртае ўвагу вучоны, у цяперашні час ні ў Беларусі, ні ў суседніх краінах прыродныя ўльтрапрэсныя бутыляваныя воды не выпрацоўваюцца, што паказвае на значны экспартны патэнцыял выяўленага ў Беларусі гідрамінеральнага рэсурсу.

— Неабходны этап у асваенні новага для Беларусі віду рэсурсаў — гэта правядзенне спецыяльных гідрагеалагічных даследаванняў з ацэнкай эксплуатацыйных запасаў ультрапрэсных падземных вод на перспектыўных участках, — падкрэслівае вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі. — Вынікам пошукава-разведачных работ павінна стаць ацэнка эксплуатацыйных запасаў ультрапрэсных падземных вод на выдзеленых перспектыўных участках з зацвярджэннем гэтых запасаў у Рэспубліканскай камісіі па запасах карысных выкапняў. Гэта дасць магчымасць прыцягнуць інвестараў для прамысловага асваення радовішчаў ультрапрэсных падземных вод, — рэзюмуе суразмоўца.

Між тым сёння і ў самім Лельчыцкім раёне трымаюць на кантролі гэту перспектыўную тэму развіцця прамысловасці.

Як звярнула ўвагу **намеснік старшыні Лельчыцкага райвыканкама Аксана ДРЫНЕЎСКАЯ,** сапраўды важнай падзеяй стала прадстаўленне інвестыцыйнага праекта па здабычы ўльтрапрэсных вод на пляцоўцы «Нетра-2024». Гэты інвестфорум праходзіў у Гомелі ў рамках Беларускага інвестыцыйнага форуму і сабраў кіраўнікоў рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў, прадстаўнікоў профільных галін, прамыслоўцаў, вучоных, бізнесменаў і прадстаўнікоў рэгіёнаў.

— На сустрэчы з удзельнікамі быў дэталёва прадстаўлены праект па стварэнні на тэрыторыі Лельчыцкага раёна прадпрыемства па здабычы і разліве вады высокай якасці, — адзначае Аксана Дрынеўская.

У Лельчыцкім райвыканкаме ўпэўнены, што рэалізацыя такога праекта — рэальная магчымасць скласці канкурэнцыю брэндам з сусветным імем.

— На сайце Лельчыцкага райвыканкама ўсе ахвотныя змогуць глыбей пазнаёміцца з гэтай тэмай, — дадала Аксана Генадзьеўна. — У раздзеле «Інвестару» размешчана прамая спасылка на афіцыйны рэсурс Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі Рэспублікі Беларусь. Тут сярод прапаноў «Дарожнай карты інвестара» сабрана падрабязная інфармацыя па праекце стварэння прадпрыемства па здабычы і разліве прыроднай натуральнай ультрапрэснай і дзіцячай пітной вады. У праекце прапісаны чаканы эканамічны эфект ад яго рэалізацыі. Гэта і стварэнне новых працоўных месцаў, і павелічэнне экспарту прадукцыі, — патлумачыла намеснік старшыні Лельчыцкага райвыканкама.

Дарэчы, як пераканаӯы ў раёне, адкрыццё прадпрыемства па здабычы і разліве «празрыстага золата» на тэрыторыі Лельчыцкага раёна дапамагло б узмацніць у цэлым вытворчы патэнцыял Гомельшчыны. Ультрапрэсныя падземныя воды рэалізоўваюцца толькі ў шкляной тары, што надасць дадатковы імпульс развіццю шкляной прамысловасці вобласці і развіццю існуючым у рэгіёне вытворчасцям упакоўкі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Уражанні

# «ШЧАСЦЕ І ГОНАР — ПАБЫВАЦЬ ТУТ»

## У Палац Незалежнасці завіталі педагогі

**Наведаць Палац Незалежнасці гэтым разам выдалася магчымасць педагогам і работнікам устаноў адукацыі і Мінскай міжнароднай гімназіі. Гэта падзея стала для іх сапраўдным падарункам да нядаўняга прафесійнага свята.**



Хоць рэзідэнцыя Прэзідэнта — пляцоўка цэнтральная, афіцыйная, статусная, але ні ў якім разе не адасобленая. Госці прайшліся па самых пазнавальных залах, якія выконваюць асноўныя прадстаўнічыя функцыі. Менавіта тут амаль кожны дзень працуе Прэзідэнт, прымаюцца найважнейшыя рашэнні, праходзяць яркія міжнародныя сустрэчы.

Рашэнне аб будаўніцтве Палаца Незалежнасці было прынята Аляксандрам Лукашэнкам у 2011 годзе. Дарэчы, аб'ектаў такога маштабу дагэтуль у краіне не было.

Сказана — зроблена. Беларускімі майстрамі Палац быў узведзены ўсяго за 30 месяцаў замест запланаваных 57, а ўжо ў кастрычніку 2013 года пляцоўка прымала сваіх першых наведвальнікаў.



Варта адзначыць, што, ставячы задачу аб будаўніцтве палаца, Прэзідэнт звярнуў увагу: аб'ект павінен быць узведзены не толькі беларусамі, але і пераважна з беларускіх матэрыялаў — так і зрабілі.

Усе інтэр'еры Палаца Незалежнасці выкананы ў класічным стылі, што абумоўлена афіцыйнасцю пабудовы. Нацыянальныя матывы галоўным чынам выяўляюцца ў арнаменце, які прасочваецца ў залах і на калідорах пляцоўкі. У агульнай арнаментыцы палаца вельмі важным з'яўляецца лейтматыў святыні беларускага народа — слуцкіх паясоў.

Свaімі ўражаннямі ад першых хвілін знаходжання на галоўнай пляцоўцы краіны падзялілася **настаўніца рускай мовы і літаратуры сталічнай гімназіі № 22 Галіна ЧЭПЕЛЕВА:**

— Што такое Палац Незалежнасці, ведае ўся краіна. Вядома, адчуваю гонар, што ў Беларусі ёсць такая велічная пляцоўка. Цікава не проста паглядзець на яе звонку, але і пабываць унутры. Адчуць гэтую моц. Першая зала, у якой мы сёння апынуліся, напоўнена святлом, асаблівым адчуваннем урачыстасці. Калі тут стаіш, разумееш, што з'яўляешся часткай цудоўнай краіны — нашай Беларусі.

**Лагапед сталічнага яслі-садка № 252 Ірына САБАЛЕЎСКАЯ** з'яўляецца маладым спецыялістам і нават не магла падумаць, што ей сёлета выдасца такая цудоўная магчымасць — пабываць на экскурсіі ў Палацы Незалежнасці.

— Тут вельмі прыгожа, я вельмі ўражана, — адзначыла яна. — Прыемна быць часткай педагагічнай супольнасці і мець магчымасць наведваць такія пляцоўкі. Вельмі ўдзячна за запрашэнне.

**Анастасія ДЗЕНІСЕВІЧ, настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі № 34 г. Мінска** паведаміла, што запрашэнне ў Палац Незалежнасці стала для яе сапраўднай нечаканасцю, а яго наведванне надоўга захаваецца ў памяці:

— Я тут упершыню і ўражана прыгажосцю пабудовы. Было вельмі цікава праслухаць экскурсію. Шчасце і гонар — пабываць тут. Ганаруся сваёй краінай і людзьмі, якія змаглі ўвасобіць такую прыгажосць.

**Яна ВАЛАСАЧ, фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Брытанцам пагражае рэзкі рост рахункаў за электраэнергію



Вялікабрытанія зноў можа сутыкнуцца з рэзкім ростам тарыфаў на электраэнергію на фоне залежнасці ад газу, якая захоўваецца, паведаміла газета The Guardian. Па меркаванні экспертнай групы кіраўнікоў галіны, краіна рызыкуе сутыкнуцца з паўтарэннем рэзкага росту цэн на энерганосьбіты, які прывёў да крызісу кошту жыцця, паколькі занадта моцна залежыць ад газу. Крызіс мацней за ўсё ўдарыць па тых, «хто менш здольны супрацьстаяць цэнавым шокам». У справаздачы экспертнай групы раскрытыкаваны меры ўрада па падтрымцы насельніцтва, якія, па даных Нацыянальнай статыстычнай службы Вялікабрытаніі, абышліся казне больш чым у 78 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў, але пакінулі каля 7,5 мільёна хатніх гаспадарак ва ўмовах паліўнай беднасці, а плацельшчыкаў — з вялікімі запазычанасцямі перад энергетычнымі кампаніямі. Галоўны эканаміст арганізацыі CBI Economics Луіза Хэлем заўважыла, што энергетычны крызіс выклікаў шокавую хвалю ў эканоміцы, якая закранула практычна ўсе прадпрыемствы краіны, асабліва прамысловасць, малы бізнес і буйныя кампаніі.

## У прыгарадзе Бруселя папуляцыю галубоў рэгулююць кантрацэптывамі



У Іксelesе галубам раздаюць супрацьзачаткавае зерне, каб кантраляваць іх папуляцыю. «Мы спрабавалі знайсці найлепшую формулу», — распавёў Euronews Іў Руе, намеснік мэра Ікселеса. Паводле яго слоў, гэтая сістэма размеркавання кантрацэптыўнага зерня, запушчаная ў 2021 годзе, дапамагла скараціць папуляцыю галубоў прыкладна на 40 працэнтаў. Раней муніцыпалітэт, які мяжуе з Бруселем, атрымліваў велізарную колькасць скаргаў на нязручнасці, што прычыняюцца гэтымі птушкамі, якіх часам называюць «лятальнымі пацукамі». Гэтая сістэма абыходзіцца ў 10 тысяч еўра за год. Іншыя еўрапейскія гарады, такія як Страсбург і Барселона, таксама выкарыстоўваюць кантрацэптыўны корм для галубоў.

## У Ліване звыш мільёна дзяцей пазбавіліся доступу да адукацыі з-за баявых дзеянняў



Такую інфармацыю агучыў намеснік выканаўчага дырэктара Дзіцячага фонду ААН Тэд Чайбан, паведаміла ТАСС. «1,2 мільёна дзяцей пазбаўлены магчымасці атрымліваць адукацыю. У дзяржаўныя школы альбо немагчыма дабрацца, альбо яны пашкоджаны з-за вайны, альбо выкарыстоўваюцца ў якасці сховішчаў», — прыводзіць словы Тэда Чайбана Associated Press. Па яго меркаванні, з-за сітуацыі, якая склалася, Ліван можа сутыкнуцца з рызыкай з'яўлення «страчанага пакалення». Ён таксама сказаў, што звыш 400 тысяч дзяцей у Ліване былі вымушаны пакінуць свае дамы за апошнія тры тыдні, многія з іх размешчаны ў перапоўненых часовых сховішчах. Па даных Associated Press, дзяржаўная сістэма школьнай адукацыі ў Ліване сур'ёзна пацярпела з-за баявых дзеянняў. Гэта адмоўна адбіваецца на адукацыі не толькі ліванскіх дзяцей, але і дзяцей найболей уразлівых пластоў насельніцтва краіны, такіх як палесцінскія і сірыйскія бежанцы.

# ...І халва з пякучым перцам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі вы па сваёй дзейнасці далёкія ад кандытарскай сферы, то, напэўна, не ведаеце, што на такіх прадпрыемствах работа над навагоднімі падарункамі пачынаецца... у лютым. Практычна адразу пасля новага года — папярэдняга. Спецыялісты падводзяць вынікі мінулай навагодняй кампаніі і, улічваючы «па гарачых слядах» пакупніцкі попыт і перавагі, пачынаюць работу над навагоднім асартыментам наступнага сезона зімовых свят. У гарачым ліпені, як правіла, асартымент гэты ўжо дэталёва прадуманы: ад набораў салодкіх прысмакаў у кожным відзе падарунка да іх упакоўкі. А да канца кастрычніка — пачатку лістапада ўсё практычна гатова: хоць зараз святкуй Новы год! Дарэчы, паводле аператыўнай інфармацыі, на сёння на «Камунарцы» і «Спартаку» ўжо сабрана каля 1 млн штук навагодніх баулаў.

## БОЛЬШ ДЗЯЦЕЙ — БОЛЬШ ЦУКЕРАК

— Кожны год асартымент падарункаў абнаўляецца, бо тэхнолагі кандытарскіх прадпрыемстваў канцэрна пастаянна распрацоўваюць новыя віды вырабаў, — расказала **намеснік начальніка ўпраўлення па вытворчасці прадуктаў харчавання канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Аксана БЛІЗНЮК.**

Працэс камплектацыі навагодніх падарункаў вельмі адказны і працаёмкі, адзначыла прадстаўнік канцэрна.

— Падарункі збіраюцца ўручную: камплектацыя пачынаецца ў першыя дні верасня і доўжыцца да канца снежня. На гэты перыяд на прадпрыемствы прыцягваюцца дадаткова каля 300 чалавек. Сёлета на навагоднюю кампанію фабрыка «Камунарка» набрала ў свой персанал 170 чалавек, «Спартак» — каля 110 чалавек. Асноўны прынцып камплектацыі падарункаў — разнастайнасць: шакалад, карамель, вафлі, печыва, мюслі, халва...

Разам беларускія кандытарскія прадпрыемствы да сустрэчы 2025 года выпусцяць не менш чым 2,6 млн салодкіх падарункаў, расказала прадстаўнік канцэрна «Белдзяржхарчпрам»: «Камунарка» — 1,5 млн падарункаў і «Спартак» — 1,1 млн.

— Для параўнання: у 2016 годзе было выпушчана 1,6 млн навагодніх салодкіх падарункаў, — сказала Аксана Блізнюк.

З чым гэта звязана? Згодна са статыстыкай, на 1 студзеня 2016 года ў нашай краіне пражывала 1,4 млн дзяцей, а на 1 студзеня 2024 года — 1,85 млн маленькіх грамадзян, адзначыла спецыяліст.

Штогод навагоднія падарункі фасуюцца ў баулы, і ў гэтым годзе такіх у продажы будзе больш за 80 разнавіднасцяў, а іх вага — ад 245 грам да 3 кіло. Таксама фірменныя крамы флагманаў айчыннай кандытарскай галіны — «Камунаркі» і «Спартака» — даюць пакупнікам магчымасць індывідуальна сабраць унікальны падарунак для родных і любімых на ўласны густ, улічваючы толькі свае перавагі. Бо салодкія прысмакі, як і духі, — тая сфера, дзе наша індывідуальнасць праяўляецца найбольш ярка.

## ЖОЎТЫ ЧАМАДАНЧЫК, МІШКА-КАСМАНАЎТ І ПАШТОЎКІ З ШАКАЛАДКАЙ

Словам, выбар у перадднавагоднія дні-2024 кандытары прадстаўляюць спажыўцу сапраўды велізарны: вырашылі здзівіць нас не толькі колькасцю, але і разнастайнасцю салодкіх навагодніх набораў. Каб не разбегліся вочы, унясём яснасць загадзя...

Мабыць, не будзе памылкай сцвярджэнне, што калі ў заходніх краінах з навагоднімі святамі ў спажыўца асацыіруецца кока-кола, то ў Беларусі — шакалад ад «Камунаркі». Сёлета ў фабрыкі — больш за 45 відаў навагодніх падарункаў. У тым ліку інтэрактыўных (з гульнямі і вырабамі: з упакоўкі можна будзе зрабіць, выразаўшы па намечаным контуры, напрыклад, кармушку для птушак). Што да ўпаковак навагодніх падарункаў (тэрыторыя самага яркага крэатыву пад Новы год), то гэта мяккія цацкі, кардонныя ўпакоўкі, заплечнікі, тубы.










— Наш эксклюзіў — унікальны чамаданчык. Такога раней не было, — праводзіць прэзентацыю **Дар'я АРЛОВА-ЛІТВІНАВА, спецыяліст упраўлення маркетынгу і продажаў СААТ «Камунарка».**

Чамаданчык радаснага ярка-жоўтага колеру. Пасля таго, як салодкае напаўненне будзе з'едзена, дзіця можа выкарыстоўваць яго для перавозкі сваіх рэчаў і цацак у падарожжы — да бабулі, на адпачынак на мора, на дачу або ў летні лагер.

Туба-«скарбонка» навучыць дзяцей беражлівасці і разумнаму абыходжанню з фінансамі. З'еў цукеркі — пачынай збіраць грошы: ідэя спадабаецца і бацькам, і маленькім ласунам. Салодкі падарунак-скарбонка называецца «12 крокаў да мары».

— На навагодніх пінгвінах і медзведзянятках, якія ўпрыгожваюць упакоўку (туба змяшчае 1 кг цукерак), можна пісаць месяц і суму, якую адклала дзіця, а таксама мэту (напрыклад, малы збірае на веласіпед), — тлумачыць Дар'я Арлова-Літвінава.

Сімвал надыходзячага 2025 года па ўсходнім гараскопе — Змяя, і, вядома, кандытары не маглі не адлюстраваць гэта на ўпакоўках навагодніх падарункаў.

У прыватнасці, сярод салодкіх падарункаў у выглядзе мяккіх цацак ад «Камунаркі» — прыгожая жоўтая змяя-падушка, якая не дасць стаміцца шыі ў машыне або падчас пералёту. Яшчэ адна мяккая цацка-ўпакоўка «Камунаркі» сёлета — медзведзяня-касманаўт, адсылка да таго, чым запомніўся адыходзячы год: касмічным палётам Марыны Васілеўскай, першага касманаўта ў гісторыі суверэннай Беларусі. Акрамя таго, навінка гэтага года для дзятвы — «салодкі» адвэнт-каляндар на 15 дзён, распавяла прадстаўнік фабрыкі. Ну, а для дарослых (бо на Новы год усе мы чакаем падарункаў і цудоўных сюрпрызаў, колькі б гадоў нам ні было) распрацаваны таксама шэраг салодкіх набораў. І ў прыватнасці падарунак у фармаце VIP. Гэта чароўная шкатулка на магнітах, якая змяшчае паўтара кілаграма найсмачнейшых шакаладных цукерак. Падыдзе як у якасці прадстаўнічага падарунка дзелавым партнёрам, так і прыемнага навагодняга сюрпрызу самому сабе.

— У фірмовым гандлі самыя папулярныя пачкі цукерак — «Вячэрні Мінск», «Ад «Камунаркі» з любоўю», «Птушынае малако» і іншыя — прапануем у навагодніх «пенальчыках», — распавяла спецыяліст. — Цікавае новаўвядзенне гэтага года — для тых, хто будзе шукаць невялікі падарунак, навагодні сувенір. Гэта паштоўкі, куды можна ўкласці любы шакалад вагой 80—90 грамаў.

Па жаданні пакупнікоў да салодкага падарунка можна будзе дадаць сертыфікат на куплю ў фірменных крамах і секцыях «Камунаркі» (на суму ад 10 да 100 рублёў), а таксама купоны на зніжкі ў крамах партнёраў фабрыкі: «Mark Formelle», дастаўка ежы, салон ювелірных вырабаў і г. д.

## КАГО ПАВІНШУЕ ЭРЫКА?

Разнастайныя ўпакоўкі і цікавыя фарматы для сваіх навагодніх падарункаў распрацаваў і «Спартак» (прадпрыемства, дарэчы, сёлета адзначыла стагадовы юбілей).

— Мы падрыхтавалі каля 70 навагодніх дызайнаў падарункаў, — расказаў **спецыяліст аддзела рэкламы і маркетынгу СП ААТ «Спартак» Мікіта МАЛАШКОЎ.** — Гэта розныя тубы, упакоўкі з кардону і тканіны, мяккія цацкі, бляшанкі і навінка мінулага года, упадабаная пакупнікамі, — адвэнт-календары.

Адвэнт-календары з прысмакамі ад «Спартака» будуць у продажы і ў гэтым годзе, вялікі і маленькі (на месяц і палову месяца). Не засталася фабрыка ў баку ад павеваў часу: на пакунках можна будзе знайсці QR-коды, каб паслухаць казку або каб пачак з падарункам ажыў на экране тэлефона.

— Усе нашы падарункі інтэрактыўныя. Гэта і папяровыя фарматы (пазлы, развіццёвыя кніжкі), і, вядома ж, QR-коды, якія паглыбляюць дзіця ў святочную навагоднюю рэальнасць. Удосталь можна будзе нагуляцца і дзецям, і таксама, думаю, нашы фарматы будуць цікавыя нават бацькам, — падкрэсліў прадстаўнік кандытарскага прадпрыемства «Спартак».

Шырокім будзе не толькі вагавы дыяпазон падарункаў (адны толькі тубы прадпрыемства прадставіць у вазе ад 1,2 да 2,5 кг), але і дыяпазон цэнавы, зазначыў ён: кожны зможа знайсці тое, што яму падыходзіць. Вядома ж, не забыты сімвал года. Напрыклад, ёсць у «Спартака» свая мяккая цацка-змяя: апякунку надыходзячага Новага года дызайнеры фабрыкі зрабілі зялёнай (у дакладнай адпаведнасці з усходнім гараскопам). Гэта, дарэчы, кобра, а яшчэ ў яе ёсць імя — Эрыка.

— Змяя аддзяляецца ад пакета цукерак і з'яўляецца выдатным дадаткам да салодкага падарунка, — сказаў Мікіта Малашкоў.

І, вядома, самым розным будзе салодкае напаўненне падарункаў.

— Фабрыка шматпрофільная, так што напаўненне будзе разнастайным: ад шакаладу і цукерак да печыва і ледзянцовай прадукцыі. Усяго мы выпускаем каля 350 найменняў ласункаў, — расказаў маркетолаг.

Дарослым «Спартак» прапануе навагоднія інтэрпрэтацыі ўпадабаных набораў шакаладных цукерак.

## САКРЭТНЫ ІНГРЭДЫЕНТ

Знакаміты «Чырвоны харчавік» да Новага года — 2025 дорыць ласунам жавальны зефір: «мандарынкі» з адпаведным мандарынавым смакам і «ялінкі» (смак марцыпана).

— Нашы навінкі ў надыходзячы Новы год — зефір з навагоднімі або зімовымі смакамі. Сёлета — са смакам «клубніцы і шампанскае». Яшчэ адна цікавая пазіцыя — латэ-карамель, — расказала **Надзея ЯЎЦЕХАВА, начальнік сектара стратэгічнага планавання і развіцця ААТ «Чырвоны харчавік».**

Гэтая, апошняя, навінка змяшчае сакрэтны інгрэдыент: на пакунку нават ёсць на гэта ўказанне. Прыемная інтрыга заўсёды цікавая пакупніку, асабліва пад Новы год, калі ўсе мы чакаем чараўніцтва. Зрэшты, раскрыем сакрэт. У складзе салодкага зефіру ёсць трохі солі — яна адцяняе саладосць латэ і карамелі, надае ласунку пікантныя ноткі. Яшчэ адна навагодняя навінка (хутчэй для дарослых) — халва з пякучым перцам.

— Такую мы яшчэ не выпускалі. Думаю, смак будзе цікавы многім, ён дастаткова нетрадыцыйны, — сказала Надзея Яўцехава.

А дзятву пад Новы год парадуе жавальны мармелад з рознымі ліманаднымі смакамі. Будуць на прылаўках і навагоднія наборы жавальнага мармеладу розных відаў ад «Чырвонага харчавіка». Ну, а ў якасці падарункаў для дарослых прадпрыемства прапануе сувенірныя наборы ў навагодніх чахлах. Напрыклад, набор «Майстар зефірных спраў» — гэта зефір ручной работы, пакрыты зварным уручную шакаладам. Упадабаны пакупнікамі набор «Пані Пасціла» пад гэты Новы год апранецца ў прыгожы «футравы кажушок». Таксама ў продаж паступяць наборы цукерак «Канфемілія» (упакоўка — у чорна-бардовай колеравай гаме): ідэальны спосаб павіншаваць з Новым годам каханых мужчын. Яны таксама вельмі любяць салодкае, хоць часам і не прызнаюцца ў гэтым.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## На адной хвалі

# У прасторы музыкі і творчасці

**Сёлета па выніках першага тура XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» ў паўфінал трапілі 179 удзельнікаў у пяці намінацыях.**




